Напярэдадні падзеі

# ГІСТОРЫЯ НА ЛЁДЗЕ

## Беларусь упершыню прыме чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні




**З 21 па 27 студзеня на лёдзе «Мінск-Арэны» пройдзе 111-е першынство кантынента. Беларускія гледачы змогуць убачыць наймацнейшых фігурыстаў Еўропы, у тым ліку шасціразовага чэмпіёна кантынента ў адзіночным катанні Хаўера Фернандэса. На турніры традыцыйна будуць разыгрывацца медалі ў чатырох відах праграмы: мужчынскім адзіночным катанні, жаночым адзіночным катанні, парным катанні і танцах на лёдзе.**

*«Гэта падзея, якая ўвойдзе ў нашу гісторыю, бо гэта від спорту, які быў любімы як у СССР, так і ў эпоху нашай незалежнасці,* — адзначае **намеснік міністра спорту і турызму краіны Аляксандр БАРАУЛЯ.** — *Фігурнае катанне карыстаецца цікавасцю ў нашых грамадзян, гэтым спортам сёння займаюцца каля 1100 чалавек, але думаю, на самай справе гэтыя лічбы большыя. У нас ёсць трэнерскія кадры, інфраструктура, умовы для занятаў фігурным катаннем, але ёсць, вядома, і праблемы».*

З мэтай вывучэння вопыту арганізацыі падобных чэмпіянатаў беларуская дэлегацыя нядаўна пабывала на этапе Кубка свету ў Маскве, дзе пераняла вопыт расійскіх калег. Аляксандр Бараулю адзначыў, што перад беларусамі стаіць задача арганізаваць турнір на высокім узроўні. *«Ужо створаны аргкамітэт, вядзецца планавая работа, у нас ужо ёсць вялікі вопыт у правядзенні спаборніцтваў, але я вымушаны адзначыць, што ў фігурным катанні ёсць шэраг спецыфічных асаблівасцяў, дробязяў і тонкасцяў, якія вызначаюць поспех гэтага турніру».*

Акрамя таго, задача кіраўнікоў і трэнерскага штаба — належным чынам падрыхтаваць беларускіх фігурыстаў, каб гледачы маглі атрымаць асалоду ад выступлення нашых спартсменаў. Імёны фігурыстаў, якія прадставяць Беларусь на чэмпіянаце, дакладна пакуль не вядомыя. Прэтэндэнты на барацьбу ў танцах Ганна Кубліковa і Юрый Гуліцкі зараз рыхтуюцца ў Маскве пад кіраўніцтвам вядомага спецыяліста Аляксандра Жуліна. Хутка яны будуць выступаць на міжнародных спаборніцтвах у Варшаве і Заграбе. Менавіта па выніках гэтых турніраў у кіраўнікоў будзе разуменне аб ступені гатоўнасці пары.

Прэтэндэнтамі на выступленне ў адзіночных спаборніцтвах сярод мужчын з'яўляюцца Аляксандр Лебедзеў і Якаў Зянько, хто з іх будзе прадстаўляць краіну на еўрапейскім першынстве, вырашыцца на чэмпіянаце Беларусі, які пройдзе 15—16 снежня. Вядома, запаветны пропуск атрымае пераможца.

У парным катанні справы ідуць кую горш, дарослая беларуская пара Таццяна Данілава і Мікалай Камянчук год таму развіталіся з прафесійным спортам, новыя маладыя фігурысты пакуль па ўзросце не падыходзяць для выступлення на чэмпіянаце Еўропы, таму спаборніцтвы сярод спартыўных пар пройдуць без удзелу беларусаў.

У жаночым адзіночным катанні нашы спартсменкі цяпер знаходзяцца на стадыі набору прахаднога тэхнічнага бала, ад вынікаў іх выступленняў будзе залежаць, ці трапяць яны на дамашні чэмпіянат.

Адзначым, што турнір у Мінску наведае шэраг ганаровых і вядомых людзей у свеце спорту, сярод іх Таццяна Тарасава, Алена Чайкоўская, Наталля Бесцям'янава, Андрэй Букін і Аляксей Ягудзін.

Дарэчы, абанементы на чэмпіянат Еўропы ўжо паступілі ў продаж, іх кошт 200 рублёў. Па гэтым білеце заўзятары змогуць наведаць усе спаборніцтвы турніру і ў тым ліку гала-прадстаўленне. Неўзабаве ў продаж паступяць і адзінкавыя білеты, іх кошт будзе вар'іравацца ад 5 да 50 рублёў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Інавацыі ў адукацыі

# ТОЛЬКІ ЛІЧБА!

**У БДУ распрацаваны электронныя залікова выя кніжкі. Гэта нова ўвядзенне было закладзена ў Стратэгію лічбавай трансфармацыі ўніверсітэта.**

Новыя лічбавыя фарматы дакументаў дазваляюць эканоміць сродкі і аптымізаваць атэстацыйны працэс у БДУ. Дарэчы, толькі ў гэтым годзе за кошт укаранення новых студэнцкіх білетаў на аснове міжнародных банкаўскіх карт універсітэт сэканоміў каля 40 тысяч рублёў. У найбліжэйшы час планаванне работы выкладчыкаў, іх справаздачы аб выкананні вучэбных даручэнняў, журналы куратараў, іншыя дакументы будуць весціся толькі ў электронным выглядзе ў асабістых кабінетах выкладчыкаў на ўнутраным сайце БДУ.

У адрозненне ад традыцыйнай інфарматызацыі лічбавая трансфармацыя дазволіць мадэрнізаваць змест адукацыі і тэхналогій навучання, аптымізаваць асноўныя працэсы дзейнасці ўніверсітэта і яго структуру.

У БДУ ўжо распрацаваны камплект творчых заданняў па розных дысцыплінах, праведзена больш за 100 заняткаў па новых методыках эўрыстычнага, дыялогавага навучання, у тым ліку — у дыстанцыйнай форме. Больш за 500 выкладчыкаў прынялі ўдзел у анлайн-семінарах па гэтых методыках.

Мяркуецца пашырыць магчымасці для выбару студэнтамі дысцыплін і перайсці на індывідуальныя тэрміны вывучэння асобных курсаў. На лічбавых платформах у навучальны працэс будуць укараняцца сістэмы развіццёвага, эўрыстычнага, дыялогавага навучання, арыентаваныя на творчую самарэалізацыю студэнтаў, развіццё ў іх крытычнага мыслення і крэатыўных здольнасцяў, стварэнне ўласнага адукацыйнага прадукту. Рэалізацыя асноўных задач стратэгіі лічбавай трансфармацыі прадугледжвае ўкараненне анлайн-навучання, пашырэнне экспарту дыстанцыйных адукацыйных паслуг, мадэрнізацыю бізнес-працэсаў на аснове лічбавых беспапяровых тэхналогій.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ДЫЯЛОГ ДЛЯ ПАРТНЁРСТВА

**У Міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ёханеса Рау распачаўся XVI Мінскі форум. Тэма гэтага года: «Беларусь і ЕС — будучыня партнёрства: дыялог, развіццё, дыгіталізацыя».**

Кожны год у беларускай сталіцы па запрашэнні арганізацыі «Нямецка-беларускае таварыства» збіраюцца палітыкі, грамадскія актывісты і эксперты з розных краін, каб абмеркаваць пытанні адносін паміж Беларуссю, Германіяй і Еўрасаюзам. Што датычыцца двухбаковага супрацоўніцтва, то **генеральны дырэктар Нямецка-беларускага таварыства Райнер ЛІНДНЕР** сказаў, яно выходзіць на новы ўзровень.

— Мы чакаем, што ў мерапрыемстве прыме ўдзел каля 320 гасцей з 20 краін. Гэта своеасаблівы рэкорд, — паведаміў ён.

На форуме таксама прагучаць тэмы, прысвечаныя перспектывам рэгіянальнага супрацоўніцтва ў Еўропе, асаблівасцям эканамічных рэформаў у Беларусі, а таксама магчымасці ўдзелу грамадзянскай супольнасці ў рэгіянальным развіцці Беларусі.

**Ганна ЮНЧЫЦ.**

### ДНЯПРО ЗНОЎ ЗАРЫБІЛІ СЦЕРЛЯДДЗЮ

**Федэральнае агенцтва па рыбалоўстве Расіі правяло чарговае зарыбленне трансгранічнага ўчастка Дняпра. У раку ў раёне Смаленска выпусцілі каля 3,5 тысячы асобін малявак сцерлядзі. Па запрашэнні расійскага боку на зарыбленні прысутнічаў начальнік Віцебскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.**

У жніўні 2016 года ў Дняпры адбылася масавая гібель рыбы з-за буйнога замору на тэрыторыі Смаленскай вобласці. Загінулая рыба некалькі дзён плыла ўніз па цячэнні. Каб аднавіць запасы Дняпра і ўзнавіць папуляцыю сцерлядзі, якая раней была аб'ектам промыслу на гэтай рацэ, спецыялісты прыродаахоўных ведамстваў Беларусі і Расіі дамовіліся рэгулярна праводзіць зарыбленне. За два наступныя гады ў раку ўсялілі амаль 32 тысячы асобін рознаўзроставых малявак сцерлядзі, больш за восем тысяч экзэмпляраў сяголеткаў шчупака і каля тысячы двухгадовых сазанаў.

У Беларусі сцерлядзь пакуль занесена ў Чырвоную кнігу, вылоўліваць яе забаронена, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

### У ГОМЕЛІ ЖАНЧЫНА ЎВАЛІЛАСЯ Ў СКЛЕП

**Паведамленне пра гэтае здарэнне ў прыватным жылым доме паступіла ў цэнтр аператыўнага кіравання ўдзень.**

Сітуацыю ўскладняла тое, што ўваходныя дзверы ў жыллё былі зачыненыя знутры. З дома жанчына прасіла аб дапамозе. Высветлілася, што пенсіянерка аступілася і ўвалілася ў склеп, самастойна падняцца не можа.

Ратавальнікі знялі шкло з аконнага праёма і такім чынам трапілі ўнутр. У адкрытым склепе на глыбіні двух метраў знаходзілася гаспадыня дома. Па яе словах, яшчэ напярэдадні вечарам, спускаючыся ў склеп, яна падвярнула нагу і ўпала.

Работнікі МНС дасталі жанчыну і перадалі яе брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Пацярпелую шпіталізавалі ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Тэлефон пытанняў і адказаў

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць і ў гэтую суботу, 24 лістапада. У аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме на званкі будуць адказваць з 9.00 да 12.00:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Што на дварэ?

# СНЕГ, МОКРЫ СНЕГ, МЕСЦАМІ З ДАЖДЖОМ

## У панядзелак уначы пры праясненнях мінус 12 градусаў, а днём да 2 цяпла

**Гэтымі днямі ўмовы надвор'я ў краіне вызначае перыферыя скандынаўскага антыцыклону. Пераважае воблачнае без істотных ападкаў надвор'е з тэмпературным фонам, блізкім да сярэдніх шматгадовых значэнняў. А ў гэтыя выхадныя чакаюцца кароткачасовыя ападкі і днём да плюс 3 градусаў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У гэтыя выхадныя дні ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць малаактыўныя атмасферныя франты, якія рухаюцца да нас з боку Заходняй Еўропы. У суботу месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі (снег, мокры снег, днём па паўднёвым захадзе краіны з дажджом). У асобных раёнах чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 марозу, пры праясненнях паветра астудзіцца да мінус 11 градусаў, удзень будзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла. У нядзелю таксама месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па паўднёвым захадзе — з дажджом. У асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень — ад 3 марозу да 3 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'е ў краіне будзе ў асноўным вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым усходзе краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — 1—8 марозу, па поўначы пры праясненнях паветра астудзіцца да мінус 9 — мінус 12 градусаў, удзень па краіне чакаецца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «Дарожнікі накіруюць у вёску грэйдар»

**З вёскі Долкінды Нясвіжскага раёна са скаргай на гарачую лінію нашай газеты патэлефанаваў яе жыхар Аляксандр Кандрацьевіч Гуліцкі. Сутнасць яго звароту датычылася дарогі.**

— Гравійка, метраў на 500, уся ў ямінах, разбітая. Мне 80 гадоў, я інвалід другой групы, перасоўвацца ў такіх умовах вельмі цяжка. Да таго ж і аўтакраме не праехаць. Дарогай ніхто не займаецца. Падсыпалі б яе, загрэйдавалі! — эмацыянальна даводзіў нам заяўнік.

Яго словы мы перадалі намесніку старшыні Нясвіжскага райвыканкама Міхаілу Афанасіку, у чыёй кампетэнцыі знаходзіцца кантроль за вырашэннем вышэйагучанай праблемы. Суразмоўнік, папрасіўшы колькі часу на ўдакладненне сітуацыі, даволі аператыўна паведаміў рэдакцыі наступнае.

— Сапраўды, ёсць невялікая праблема ў Долкіндах, якую мы вырашым элементарна: дарожнікі пашлюць туды грэйдар. Асфальту ў вёсцы няма, там пясчана-гравійная дарога. Пасля нядаўніх дажджоў, вядома, яе крыху размыла, утварылася ямачнасць, — сказаў Міхаіл Вікенцьевіч.

Па словах намесніка старшыні райвыканкама, дарожная тэхніка на момант звароту вяскоўца па чарзе працавала ў іншых населеных пунктах — ва ўсе адначасова яе накіраваць немагчыма. У любым выпадку дайшла б чарга і да Долкіндаў.

— Ёсць тэхналагічныя карты ўтрымання дарог, — дадаў Міхаіл Афанасік. — Сродкі для гэтага выдзяляюцца ў залежнасці ад працягласці апошніх і нарматыўных тэрмінаў правядзення такіх работ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**